Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Грыцкавіцкі навучальна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад - сярэдняя школа»

# У краму-сталовую
(канспект экскурсіі)

Молчан Таццяна Аляксандраўна,
выхавальнік дашкольнай установы
без кваліфікацыйнай катэгорыі

аг. Грыцкевічы, 2022

Узрост дзяцей: 4-6 гадоў;

Тып маршруту: пешы

Працягласць па часе: 1г.

Адлегласць: 200 м.

Маршрут: дзіцячы сад – крама-сталовая– дзіцячы сад;

Задачы:

Даць уяўленні дзецям аб тым, якія прадукты харчавання найбольш карысныя і неабходны дзіцяці штодня; пашыраць веды аб прафесіях работнікаў сацыяльнай сферы, змесце і значнасці іх працы для жыхароў аграгарадка; навучыць дзяцей выбіраць самыя карысныя прадукты.

Папярэдняя праца: гутаркі з дзецьмі аб прадуктах харчавання, аб прафесіі прадаўца, аб паводзінах у розных месцах.

Ход экскурсіі:

Па ходзе руху да крамы, выхавальнік называе вуліцы па якіх яны ідуць. Звяртае ўвагу на будынкі, якія сустракаюцца па дарозе.

Перад уваходам у краму прапануе дзецям уважліва разгледзець будынак крамы (колер, шыльда, дзверы), звяртае ўвагу дзяцей на тэрыторыю каля крамы (парадак, наяўнасць урны для смецця).

- Увайшоўшы ў краму, мы кім становімся? (Пакупнікамі).

Усе вітаюцца, знаёмяцца.

Выхавальнік (звяртаючыся да прадаўца)

- Раскажыце, калі ласка, якія прадукты харчавання ёсць у вашай краме.

Прадавец.

- Вось тут знаходзяцца хлебабулачныя вырабы: белы і чорны ці як яго яшчэ называюць жытні хлеб. (Паказвае, зважаючы на тое, што булкі бываюць вялікія і маленькія і ёсць нарэзка). Яшчэ ёсць салодкі хлеб - выпечка: булачкі, калачы, батоны.

- Тут у нас малочныя прадукты: малако, кефір, ражанка, тварог, сыры, марожанае.

Прадавец паказвае і расказвае пра іншыя прадукты (кандытарскія вырабы, чай, макаронныя вырабы, цукар, соль).

Выхавальнік зважае на разнастайнасць упаковак тавараў (форма, велічыня, яркая расфарбоўка). Напрыклад, сок у маленькіх і вялікіх пакецiках, у розных па велічыні слоіках, бутэльках. Звяртае ўвагу на тое, што на кожным тавары ёсць цана. Для пакупкі патрэбны грошы. У краме адбываецца абмен: грошы аддаём, тавар бярэм.

Прадавец.

- Людзі выбіраюць і купляюць тыя прадукты, якія ім падабаюцца, якія ім патрэбны для таго, каб быць здаровымі і моцнымі.

Выхавальнік.

- Дзеці, а вы ведаеце, якія прадукты харчавання найболей карысныя і неабходныя вам кожны дзень? (Адказы дзяцей.)

Выхавальнік.

- Скажыце, калі ласка, адкуль бяруцца прадукты ў магазіне? (Адказы дзяцей.)

Прадавец.

- Прадукты прывозяць на машынах са склада, з базы з Нясвіжа ці з Мінска.

Выхавальнік.

- Хто яшчэ працуе ў краме? (Адказы дзяцей.)

Прадавец.

- Самы галоўны ў краме - дырэктар, ён за ўсё адказвае: за чысціню і парадак, за выкананне правіл паводзін, каб прадаўцы ветліва абслугоўвалі сваіх пакупнікоў. Ён сочыць за тым, каб у магазіне быў вялікі выбар тавараў, якія прывозіць вадзіцель, грузчык разгружае машыну з прадуктамі. Фасоўшчык насыпае прадукты ў пакеты (паказвае крупы, цукар, цукеркі, печыва), узважвае, раскладвае іх і іншыя прадукты па паліцах у краме. Парадак і чысціню ў краме наводзіць прыбіральшчыца. Дворнік прыбірае смецце і снег на тэрыторыі вакол магазіна.

Выхавальнік.

- Вось як шмат працаўнікоў крамы (просіць дзяцей назваць прафесіі). Усе яны выконваюць важную і карысную працу.

- Прадавец - гэта чалавек, які дапамагае нам купляць і аплачваць тавар.

- Як вы думаеце прадаўцом стаць лёгка? (Адказы дзяцей.)

Прадавец.

- Насамрэч ёсць спецыяльныя ўстановы, дзе будучых прадаўцоў вучаць шматлікім рэчам: бо добры прадавец павінен ведаць вельмі шмат.

- Ён не проста стаіць за прылаўкам і прадае нейкую рэч - ён павінен добра разбірацца ў тавары, які прадае, каб параіць пакупніку. Прадавец павінен умець карыстацца касай, прабіваць чэкі, добра лічыць, каб правільна даваць рэшту.

Выхавальнік прапануе дзецям дамовіцца і купіць нешта.

Дзеці развітваюцца з прадаўцом, выходзяць з магазіна.